# ТВАР І ПАТЫЛІЦА

Калі нам выпадае чакаць чаго-небудзь сярод незнаёмых людзей, мы інстынктыўна імкнемся заняць месца за бліжэйшай сьпінаю, пажадана — ля вакна. Так спакайней: у жывым твары насупраць — у адрозьненьне ад патыліцы — заўсёды адчуваецца нейкая недагаворанасьць, нейкае запытаньне, мэтафізычная неўладкаванасьць. Яшчэ незнаёмыя, мы мусім стаяць альбо сядзець надта блізка адзін да аднаго — на інтымнай адлегласьці шэпту. Адзінае, што дапамагае хоць неяк захаваць рэшткі сувэрэннай жыцьцёвай прасторы, — павярнуцца да суседзяў бокам, а калі гэта немагчыма — зрабіць твар непранікальным, павярхоўным, як фотаздымак у пашпарце. Мы адварочваемся ад чужых позіркаў (альбо хаваем хай некаторыя рысы за чорнымі акулярамі, газэтаю ці далонямі), нібыта ў твары ёсьць нешта непрыстойнае, як у недарэчна аголеных палавых органах.

Адзін з парадоксаў натоўпу — тое, што, з аднаго боку, нашы выпадковыя суседзі паступова праяўляюць усё больш індывідуальных рысаў, а зь іншага — робяцца ўсё больш падобнымі, нават фізычна імкнуцца да нейкага сярэднестатыстычнага стану: старыя тут становяцца рухлівымі і гаваркімі, а маладыя горбяцца і шаркаюць нагамі. У доўгай чарзе можна раптоўна зразумець, што людзі, якія жывуць дзеля агульнае мэты, павінны калі-небудзь стацца блізьнятамі — калі ня ў гэтым жыцьці, дык пасьля яго. (Сьмерць для нас — другая маці. Калі чалавек тут мае братоў, ён можа мець іх і ў іншым сьвеце — ранейшых і новых.)

У нашым падабенстве ёсьць адразу нешта нябожчыцкае і эмбрыянальнае. Чарга — ня толькі братняя магіла нашага часу, але і агульная матка, якая рыхтуе нас да нараджэньня ў новым аблічы (у звышмодных джынсах, напрыклад).

Напэўна, кожны згадзіўся б, каб пасьлядоўнікаў у яго было болей, а папярэднікаў — меней. У чарзе гэта азначае: больш твараў і менш патыліцаў вакол цябе. І мэту сусьветнай гісторыі (перамогу розуму над прыродай і падсьвядомасьцю) можна ператалумачыць так: усе людзі павінны павярнуцца тварам да нас і адзін да аднаго — нават тыя, каго ўжо даўно няма з намі. Я нават думаю, што ў сваё апошняе перадсьмяротнае імгненьне кожны з нас адчувае сябе Адамам, першым чалавекам на сьвеце, а ўсіх астатніх, нават бацькоў, — сваімі нашчадкамі.

У якім аблічы мусілі б мы ўваскрэснуць для жыцьця вечнага пасьля другога прышэсьця Хрыста? Найпрасьцейшы адказ — у тым, у якім мы сканаем. Але тады не зусім зразумела, навошта людзі імкнуцца пражыць як мага даўжэй: няўжо яны згодныя быць вечна старымі?

Хацелася б думаць, што мы ўваскрэсьнем з тым выразам твару і ў тым ўзросьце, у якім былі найбольш шчасьлівыя ў гэтым жыцьці. Але цалкам магчыма, што нам вернуць нейкае сярэднеарытмэтычнае аблічча альбо пакінуць увогуле бязь зьнешнасьці — каб не было чорных і белых, спакусьлівых прыгажуняў і вырадкаў, хворых і немаўлятаў. Ня выключана, што мы станемся нават больш падобнымі, чым блізьняты: атрымаем адно цела на ўсіх.

Усе твары маюць той ці іншы набор агульных рысаў, як два сказы ў тэксьце маюць аднолькавыя літары. Мілан Кундэра ў рамане “Несьмяротнасьць” выказвае здагадку, што галоўнае прызначэньне твару —

увасабляць не індывідуальнасьць чалавека, а ягонае падабенства да іншых людзей: “Аўтамабілі аднолькавай мадэлі адрозьніваюцца толькі вытворчым нумарам. Вытворчы нумар чалавечага матэрыялу — твар, гэтае выпадковае і непаўторнае спалучэньне рысаў. Твар — ня больш чым нумар экзэмпляра”.

Вынаходзтва чаргі — альбо, што тое самае, арытмэтычнага ліку — дазволіла нашым продкам прыўзьняцца над фізычнай рэальнасьцю (лік можна доўжыць да бясконцасьці і нават далей), дазволіла пры патрэбе падмяняць рэчы і падзеі іхным сымбалічным адлюстраваньнем, а зрок — уяўленьнем. Але цяпер мы самі ператварыліся ў набор лічбаў. Кожны з нас пранумараваны адрасам, тэлефонам, датамі нараджэньня бацькоў і дзяцей, нумарам цяперашняга шлюбу і г.д. Немагчыма набыць які-кольвек сацыяльны статус, пакуль табе ня знойдуць арытмэтычны эквівалент. Усе нашыя сумненьні, усе ліхаманкі духу маюць сваёй прычынаю толькі тое, што мы ня ведаем, зь якім менавіта нумарам павінны атаясамняць сябе ў першую чаргу.

Найбольш асэнсаваным жыцьцё чалавека было ў першабытную эпоху: ледзь ня кожны жэст і прамоўлены гук быў тады асьвячоны шматвяковай традыцыяй. Чым болей жыцьцё ператворана ў рытуал — тым больш твар нагадвае маску, якую гаспадар прыняў у спадчыну ад продкаў і мусіць перадаць нашчадкам.

Жывому твару недастаткова ўласных прыродных рысаў, каб скласьці зь іх устойлівы гіероგліф патрэбнага сэнсу, засьведчыць прыналежнасьць да пэўнага племя і сацыяльны статус гаспадара. Мець чысты натуральны твар без татуіровак ці расфарбоўкі для нашых продкаў азначала як бы ня мець твару ўвогуле і быць не патрэбным грамадзтву.

Твар і сёньня належыць нам менш, чым патыліца. Калі чалавек незадаволены сабой, калі выпаў з патрэбнага вобразу — ён баіцца паказваць твар нават самому сабе і адварочваецца ад люстэркаў. Менавіта за рысы твару нас трымае пад сваім кантролем грамадзтва. Вальналюбны чалавек не шкадуе свайго “я”, бо ведае: менавіта гэтае слова часьцей за ўсе іншыя мусіць крычаць у шыхце і салдат, і арыштант.

Голас надае твару дадатковае вымярэньне, надае глыбіню — але толькі сам голас, а ня словы, у якія ён заўсёды імкнецца ператварыцца. Словы зачароўваюць твар, хаваюць яго пад сабой гэтак сама, як грым ці першабытная татуіроўка. Але ў разяўленым для крыку роце праяўляецца тое, што прыхавана носіць у сабе кожны твар: спод патыліцы. Пакуль мы проста размаўляем, то ня можам зазірнуць адзін аднаму ўсярэдзіну галавы, пад покрыва маўленьня: наш позірк перахопліваюць вусны, язык і самі словы…

Нас зазвычай атаясамняюць з тварам — гэтаксама як зь імём ці нумарам. Менавіта твар, а не патыліцу пішуць на партрэтах, зьмяшчаюць у пашпарт, цалуюць альбо нявечаць. Мы баімся “згубіць твар”, “упасьці тварам у бруд”, з пагардаю ставімся да “безаблічнасьці”. І патыліца нават ня мае чым выказаць пратэст супраць гэтай дыскрымінацыі! А між іншым, яе роля ў нашым жыцьці ня менш істотная, чым роля твару, гэтага сталічнага рэгіёну цела.

Нам цяжка ўявіць сабе жывога й нават мёртвага чалавека бяз твару, але ня менш пачварным выглядаў бы і сусед з тварам вакол усяе галавы. Патыліца — гэта непрыкметны, але надзейны падмурак ня толькі асобы, але і самога грамадзтва. І найбольш відавочна гэта ў жывой чарзе, дзе кожны твар трымаецца за патыліцу папярэдніка.

Калі мы чытаем ці пішам, літары складаюцца ў нешта пасьлядоўнае і асэнсаванае дзякуючы прабелам паміж імі. Калі размаўляем, то разумеем адзін аднаго дзякуючы нявымаўленым знакам прыпынку — ледзь заўважным паўзам паміж падобнымі словамі і адрознымі сказамі. Немагчыма чытаць з патыліцаў, але яны — тая папера, на якой пішуцца твары.

Жывы твар заўсёды схіляецца да таго альбо іншага выразу. Патыліца ж заўжды застаецца эмацыйна і эстэтычна нэўтральнай, ёю цяжка прывабіць ці напалохаць. Яна амаль пазбаўлена якой-небудзь уласнай інфармацыі — гэтаксама, як маўчаньне, зь якога растуць усе словы.

Патыліца і сьпіна амаль нэўтральныя і ў сэксуальным пляне. Тут чалавек зьяўлены сьвету не як "ён" ці "яна", але як "яно". Гэта сапраўды безабаронная частка цела і таму найбольш зручная для пасьлядоўнага ўтварэньня сацыяльнай структуры, для трансфармацыі асобнага чалавека ў сэгмэнт грамадзкага цела, што мае дзясяткі альбо тысячы ног.

Паміж людзьмі ў чарзе няма неадольнай мяжы: яны перацякаюць адно ў аднаго, як перацякаюць фізыялягічныя вадкасьці з аднаго органу ў іншы. Патыліца — свайго кшталту мэмбрана, праз якую злучаюцца ў нешта адзінае і жывое два суседнія твары.

Ноч — гэта патыліца дня. Як усялякі новы дзень пачынаецца ўначы (а год узімку), так і твар пачынаецца дзесьці на папярэдняй патыліцы. Асноўны закон, паводле якога існуе грамадзтва, у вузкім сэнсе быў сфармуляваны Фройдам як мэта псыхааналізу: дзе было "яно" (чужая патыліца), там павінна стаць "я" (мой твар).

Чалавечая псыхіка складаецца з узаемададатных сфэраў сьвядомасьці і бесьсьвядомага, і грамадзтва гэтак сама ўяўляе сабой ня толькі відавочную сэрыю "мы", але і менш заўважную (прынамсі, для мовы і гісторыі) сэрыю "яны": множны лік ад бесьсьвядомага "яно".

Быцьцё нельга зьвесьці ні да агульнага "Так", ні да бязьмежнага "Не". Наяўнасьць, як і адсутнасьць, не бывае суцэльнай, не бывае татальнай. Пад маскай наяўнасьці часта можна заўважыць пустату — тады і зьяўляецца думка, што ў нашым жыцьці няма нічога нашага. Але і ў пустаце, як у расчыненых дзьвярах, заўсёды можна нешта знайсьці, намацаць, пачуць скрозь цішыню. З гэтага гледзішча нават у чужым лёсе няма нічога чужога.

Асноўная дамінанта быцьця — гэта не паўставаньне (якое павінна скончыцца агульнай і вечнай прысутнасьцю) і не распад (вынікам якога станецца адсутнасьць усяго і ўсіх), а ўтрыманьне раўнавагі паміж стратамі і набыткамі, паміж усім і нічым.

Чалавек уяўляе сабой ячэйкавую структуру, вузлы і перапонкі якой складаюць ягонае "я", а ў прамежках між імі чалавек — "ніхто". Дакладней, асоба — гэта ня проста "я", а сукупнасьць розных варыянтаў (роляў, узростаў) гэтага "я": асоба — гэта "мы" чалавека. Трэба адзначыць, што і нашае "ніхто" таксама неаднароднае, бо трансфармуецца з узростам і пераходам ад адной ролі ў грамадзтве да іншай.

У кожны момант жыцьця мы дапаўняем сьвет ня толькі тварам (сваім "я"), але і патыліцай ("нікім"). Калі зірнуць на чалавека ў ягоным разьвіцьці (прааналізаваць біяграфію ці гісторыю) — мы ўбачым альбо шэраг розных твараў, альбо чараду патыліцаў. Бег часу люструецца ня толькі ў новых імёнах, але і ў новых абшарах ананімнасьці. Ананімнасьць ня менш

індывідуальная за любое імя. “Ніхто” — гэта нашае ***alter ego***, былое ці будучае, а пакуль адсутнае ”я”.

Ніхто — гэта я безь мяне. Адсутнасьць — гэта прысутнасьць, якая не пакідае сьлядоў, якая свабодна праходзіць скрозь усе нераты жэстаў і словаў. Адсутнасьць і наяўнасьць — два бакі аднабаковай стужкі Мёбіюса. “Я” — гэта нашае ***alter nemo***, сьветлы цень нашага “ніхто”.

“Дзікая гусь ня мае патрэбы пакінуць сьлед у вадзе. Вада ня мае намеру затрымаць адлюстраваньне гусі”, — кажа кітайскае прыслоўе.